# *§ 48–0. СССР у пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.)

«АДЛІГА» РЭАБІЛІТАЦЫЯ
ЦАЛІНА «ЗАСТОЙ»
ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ
ПЕРАБУДОВА ГАЛОСНАСЦЬ
«ПАРАД СУВЕРЭНІТЭТАЎ»

Успомніце асноўныя прыкметы грамадска-палітычнай сістэмы СССР у 1930-я гг. Якую ролю савецкая грамадска-палітычная сістэма адыграла ў перамозе СССР у Вялікай Айчыннай вайне?

**1. Палітычная сістэма.** Перамога СССР над нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі абумовіла значны рост міжнароднага аўтарытэту Савецкага Саюза і пашырыла межы яго ўплыву. Для грамадска-палітычнай сістэмы СССР было характэрнае захаванне тых самых прынцыпаў і падыходаў, якія склаліся ў даваенны час.

**Сістэма органаў дзяржаўнай улады ў СССР (паводле Канстытуцыі 1936 г.)**

| Вярхоўны Савет СССР | Савет Народных Камісараў СССР (у 1946 г. пераўтвораны ў Савет Міністраў) | Абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы народных дэпутатаў |
|---|---|---|
| Найвышэйшы орган заканадаўчай улады, выбіраўся грамадзянамі тэрмінам на 4 гады | Найвышэйшы выканаўчы і распарадчы орган | Мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання |

**Выбары ў Вярхоўны Савет СССР і мясцовыя Саветы**

На выбарах у Вярхоўны Савет СССР (1946 г.) дэпутаты «непарушнага блока камуністаў і беспартыйных» атрымалі абсалютную падтрымку выбаршчыкаў. У 1946–1947 гг. былі абраныя дэпутаты мясцовых Саветаў, у якіх вялікую ролю пачалі адыгрываць былыя франтавікі, што павысіла аўтарытэт органаў улады на месцах.

Растлумачце, чаму былыя франтавікі сталі адыгрываць значную ролю ў кіраванні дзяржавай. Прывядзіце не менш за два тлумачэнні гэтага факта.

У **1977 г.** была прынятая новая *Канстытуцыя СССР*. У яе быў уключаны артыкул 6, які абвяшчаў Камуністычную партыю Савецкага Саюза (КПСС) кіруючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы. Камуністычная партыя захоўвала ключавую ролю ў грамадска-палітычнай сістэме СССР і саюзных рэспублік. КПСС ажыццяўляла кіраўніцтва масавай маладзёжнай арганізацыяй — Усесаюзным Ленінскім Камуністычным Саюзам Моладзі (камсамолам). Камсамол быў актыўным памочнікам і рэзервам КПСС.

Выбары ў Саветы праводзіліся на безальтэрнатыўнай аснове. Дзейнасць Саветаў усіх узроўняў не была самастойнай і, як правіла, зводзілася да зацвярджэння прынятых ужо рашэнняў.

## Рэформы эпохі перабудовы

Ад сярэдзіны 1980-х гг. пачалося маштабнае рэфармаванне сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сфер жыцця савецкага грамадства. У 1988 г. былі ўнесеныя змены ў Канстытуцыю СССР. Была здзейснена спроба вярнуць Саветам усю паўнату ўлады і зрабіць іх незалежнымі ад КПСС. Вышэйшым органам заканадаўчай улады рабіўся З’езд народных дэпутатаў СССР, які фарміраваў Вярхоўны Савет СССР. Быў прыняты новы выбарчы закон, паводле якога прадугледжваліся выбары ва ўсе органы прадстаўнічай улады на альтэрнатыўнай аснове (1/3 месцаў пакідалі для прадстаўнікоў дзяржаўных грамадскіх аб’яднанняў). У 1989 г. адбыліся выбары З’езда народных дэпутатаў СССР.

Напрыканцы 1980-х гг. ва ўсіх рэспубліках узніклі апазіцыйныя рухі ў форме народных франтоў. Іх выступленні насілі яскравы нацыяналістычны і сепаратысцкі характар, а дзейнасць была скіраваная на дасягненне выхаду рэспублік са складу СССР.

III пазачарговы З’езд народных дэпутатаў СССР (сакавік 1990 г.) адмяніў арт. 6 Канстытуцыі

СССР, ліквідаваўшы манаполію КПСС на ўладу ў краіне. На тым самым III пазачарговым З'ездзе народных дэпутатаў СССР М. Гарбачоў быў абраны Прэзідэнтам СССР.

Аднак многія дзеянні саюзнай улады ў спробах утрымаць сітуацыю былі запозненыя, а некаторыя, наадварот, абвастралі сацыяльна-палітычную абстаноўку. Напрыканцы 1980-х гг. у Савецкім Саюзе пачаўся *«парад суверэнітэтаў»*.

Успомніце, што такое «парад суверэнітэтаў». У чым ён выяўляўся?

**2. Узаемаадносіны ўлады і грамадства: асноўныя этапы развіцця.** Характар узаемаадносін савецкай улады і грамадства ў пасляваенны перыяд змяняўся, што было абумоўлена як аб'ектыўнымі, так і суб'ектыўнымі фактарамі.

**Вяртанне да мірнага жыцця**

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны савецкая краіна вярталася да мірнага жыцця: было адменена надзвычайнае становішча, аднаўлялі работу дзяржаўныя, навуковыя, адукацыйныя ўстановы, быў зноў уведзены 8-гадзінны рабочы дзень, паступова спыніліся звышурочныя работы. Аднак напрыканцы 1940-х гг. стала відавочным вяртанне да палітычных метадаў 1930-х гг.

**«Адліга»**

Пасля смерці І. В. Сталіна актывізавалася рэабілітацыя ахвяр рэпрэсій, яна паскорылася пасля XX з'езда КПСС. На закрытым пасяджэнні ў лютым 1956 г. у дакладзе «Аб культе асобы і яго наступствах» М. С. Хрушчоў рашуча асудзіў многія дзеянні сталінскага кіраўніцтва, але адказнасць за дапушчаныя памылкі, у тым ліку падчас Вялікай Айчыннай вайны, усклаў выключна на І. В. Сталіна. Такім чынам з партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў таго часу (а да іх належаў і сам М. С. Хрушчоў) адказнасць за памылкі мінулага здымалася.

Прарыў у асваенні космасу, іншыя поспехі савецкіх вучоных напачатку 1960-х гг. надалі кіраўніцтву краіны ўпэўненасць у бязмежных магчымасцях савецкага грамадства. Так з'явіліся лозунгі

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

| Кіраўнік дзяржавы | | Асноўныя рысы ўнутранай палітыкі |
|---|---|---|
| **Да сакавіка 1953 г.** | | |
|  | **І. В. Сталін** (1878–1953), генеральны сакратар ЦК КПСС, кіраўнік урада | Узмацненне аўтарытарнага рэжыму. Захаванне характэрных для перыяду вайны мабілізацыйных метадаў вырашэння праблем, што ўзнікалі, жорсткай цэнтралізацыі кіравання і размеркавання рэсурсаў |
| **1953–1964 гг.** | | |
|  | **М. С. Хрушчоў** (1894–1971), першы сакратар ЦК КПСС, ад 1958 г. — кіраўнік урада | Лібералізацыя грамадска-палітычнай сітуацыі, частковая рэабілітацыя ахвяр палітычных рэпрэсій.<br>Непрадуманыя рэформы сталі падставай для адстаўкі з абвінавачваннем у валюнтарызме.<br>Узмацненне кантролю над царквой |
| **1964 — лістапад 1982 г.** | | |
|  | **Л. І. Брэжнеў** (1906–1982), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР | Час стабільнасці, росту дабрабыту насельніцтва і аўтарытэту СССР на міжнароднай арэне.<br>Запаволенне тэмпаў сацыяльна-эканамічнага росту |
| **Лістапад 1982 — люты 1984 г.** | | |
|  | **Ю. У. Андропаў** (1914–1984), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР | Пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў, укараненне дасягненняў НТП, інтэнсіфікацыя вытворчасці.<br>Спроба ўзмацніць адказнасць кіруючых кадраў, дысцыпліну ў працоўных калектывах |
| **Люты 1984 — сакавік 1985 г.** | | |
|  | **К. У. Чарненка** (1911–1985), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР | Узмацненне ролі прафсаюзаў.<br>Вызначэнне ў якасці галоўнага шляху інтэнсіфікацыі эканомікі НТП.<br>Спробы правесці рэформу адукацыі |

| Кіраўнік дзяржавы | | Асноўныя рысы ўнутранай палітыкі |
|---|---|---|
| **Сакавік 1985 — снежань 1991 г.** | | |
|  | **М. С. Гарбачоў** (1931–2022), генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР (да 1989 г.), Старшыня Вярхоўнага Савета СССР (1989–1990), Прэзідэнт СССР (1990–1991) | Беспаспяховыя спробы рэалізацыі рэформаў, накіраваных на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і рост дабрабыту насельніцтва. Дэстабілізацыя сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сітуацыі |

1. *Прааналізуйце назвы пасад першых асоб СССР. Зрабіце вывады наконт змен у сістэме органаў дзяржаўнай улады СССР.*
2. *Што сведчыла пра зрошчванне ў СССР дзяржаўнага і партыйнага апарату?*
3. *Падзяліцеся ў класе на групы. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце фактамі асноўныя кірункі ўнутранай палітыкі СССР ва ўказаныя перыяды. У чым заключаліся дасягненні і пралікі ва ўнутранай палітыцы СССР у гэты час?*

пра магчымасць «дагнаць і перагнаць Амерыку», пра пабудову камуністычнага грамадства ўжо ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі. Але пасля няўдалых рэформаў, што прывялі да крызісу ў сельскай гаспадарцы, і іншых памылак М. С. Хрушчоў страціў

Успомніце, якія гаспадарчыя рэформы былі праведзены ў перыяд праўлення М. С. Хрушчова.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся імёны людзей, якія знаходзяцца на трыбуне на Крамлёўскай плошчы Масквы разам з М. С. Хрушчовым.*
2. *Падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з гэтых дзеячаў.*
3. *Чаму ў Савецкім Саюзе надавалася велізарная ўвага асваенню космасу? Якіх поспехаў дасягнулі савецкія вучоныя і касманаўты ў гэтай галіне?*




*Плакат 1963 г. Аўтары А. Кастромічаў, С. Раскін, В. Чэрнікаў*

давер і падтрымку з боку партыйнай эліты і насельніцтва.

Разам з тым у памяці старэйшых пакаленняў перыяд знаходжання ва ўладзе М. С. Хрушчова выглядае часам аптымістычных спадзяванняў як для лёсу краіны ў цэлым, так і для жыцця кожнага савецкага чалавека. У перыяд яго кіраўніцтва палепшыліся жыллёвыя ўмовы, быў скарочаны рабочы дзень, умацаваўся савецкі рубель.

Перыяд кіраўніцтва СССР Л. І. Брэжневым часцяком характарызуюць як «перыяд застою». Аднак першыя гады брэжнеўскай эпохі не падпадаюць пад гэтую характарыстыку. Ажыццёўленая пад кіраўніцтвам старшыні Савета Міністраў СССР А. М. Касыгіна *эканамічная рэформа* **1965 г.** дала значны эфект, дзякуючы якому восьмая пяцігодка (1966–1970 гг.) атрымала неафіцыйнае найменне «залатой» і аказалася найбольш паспяховай сярод




1. Успомніце, якая сістэма кіравання эканомікай была ўведзена ў СССР у 1957 г.
2. Чаму мерапрыемствы рэформы А. М. Касыгіна паспрыялі павышэнню эфектыўнасці савецкай эканомікі? Як вы лічыце, чаму рэформа была згорнута напачатку 1970-х гг.?

усіх 12 пяцігадовых планаў развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Спалучэнне планавай эканомікі і матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках працы паспрыяла таму, што ў гэтыя гады валавы ўнутраны прадукт рос штогод больш чым на 10 %.

Паспяховай была аграрная палітыка: палепшылася забеспячэнне насельніцтва прадуктамі, многія калгасы і саўгасы перасталі быць стратнымі. У цэлым дабрабыт насельніцтва адчувальна павысіўся.

Для савецкіх людзей брэжнеўская эпоха была часам стабільнасці, бясплатных і якасных медыцыны і адукацыі, высокага статусу вучоных, настаўнікаў, працаўнікоў у цэлым, адсутнасці беспрацоўя.

Шмат у чым галоўнае дасягненне савецкага часу — стабільнасць сацыяльна-эканамічнай сферы — зрабілася магчымым дзякуючы планавай эканоміцы. Яна дазволіла дасягнуць значных поспехаў у індустрыяльным развіцці савецкай дзяржавы і падтрымліваць на высокім узроўні сацыяльную сферу. Значнай перавагай планавай эканомікі ў параўнанні з рыначнай трэба прызнаць адсутнасць крызісаў перавырабу і беспрацоўя. Апроч таго, планаванне ў маштабах краіны дазваляла падтрымліваць нізкія цэны на тавары першай неабходнасці і пазбягаць інфляцыі (абясцэньвання грашовых сродкаў).

«Застой»

Але ў 1970-я гг. асноўныя паказчыкі развіцця савецкай эканомікі панізіліся — упалі тэмпы прыросту нацыянальнага даходу, павялічылася адставанне ад краін Захаду ў сферы ўкаранення дасягненняў НТР. Прычыны былі розныя, але галоўная заключалася ў адсутнасці ў рабочых зацікаўленасці ў выніках сваёй працы.

Падтрымліваць стабільнасць у грамадстве дазволіла павышэнне сусветных коштаў на нафту:

у 1975–1985 гг. ад яе продажу СССР атрымаў каля 180 млрд долараў. Нафтадолары давалі магчымасць падтрымліваць высокі ўзровень сацыяльнай сферы, але не спрыялі развіццю прамысловасці і сельскай гаспадаркі, да таго ж рабіліся прычынай беспадстаўнага аптымізму кіраўніцтва краіны, якое не заўважала нарастання крызісных з'яў.

У 1960-я гг. у СССР пачалі заяўляць пра сябе прыхільнікі іншых палітычных поглядаў. Людзей, якія не прымалі пануючую ў краіне ідэалогію, але не заклікалі да гвалтоўных дзеянняў, называлі дысідэнтамі. Частка з іх пачала фарміраваць пры падтрымцы замежных дзяржаў «праваабарончыя рухі». Адкрытая крытыка ўлады была забаронена, але знаходзіла іншыя шляхі выражэння — праз іншасказанні і анекдоты.

Спроба выправіць сітуацыю — аднавіць кантроль над грамадствам, узмацніць адказнасць кіруючых кадраў, дысцыпліну ў працоўных калектывах, палепшыць якасць прадукцыі, якая выраблялася, — была здзейснена пры Ю. У. Андропаве. Але рэалізаваць задуманае новы генеральны сакратар партыі не паспеў.

### Перабудова

У перыяд перабудовы савецкае грамадства зазнала радыкальную трансфармацыю. Яна мела на ўвазе:

- увядзенне прынцыпу канкурэнцыі ў палітычную сістэму і пераход да шматпартыйнасці;
- стварэнне незалежных сродкаў масавай інфармацыі;
- пераход да рынавай эканомікі, якая прызнавалася найбольш эфектыўным інструментам забеспячэння балансу паміж попытам і прапановай і стварэння стымулу да мадэрнізацыі вытворчасці.

Успомніце, калі ў СССР праводзілася палітыка перабудовы. Якія традыцыйныя асновы савецкай сістэмы былі ў выніку зменены?

У савецкім грамадстве фарміравалася апазіцыя, якая мацавала свой уплыў за кошт крытыкі ўлады. Пад уплывам «перабудовачных» сродкаў масавай

інфармацыі краіны Захаду пачалі ўспрымацца ў савецкім грамадстве як узор фарміравання прававога і палітычнага жыцця і больш эфектыўнай арганізацыі грамадства «роўных магчымасцей».

Камуністычная партыя, што пачала пераўтварэнні грамадства, каб пераадолець некаторыя недахопы сістэмы, у выніку зусім страціла магчымасць уплываць на сітуацыю. Неўзабаве ў шэрагу саюзных рэспублік дабіліся прыходу да ўлады апазіцыйныя сілы.

У другой палове 1980-х гг. кіраўніцтва СССР не здолела знайсці шляхоў вырашэння сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем, якія існавалі ў краіне, не змагло прапанаваць грамадству тэарэтычна абгрунтаваную перспектыву далейшага прагрэсу існуючай сістэмы. Узяты курс на перабудову існуючай сістэмы не меў навуковага абгрунтавання. Перабудова набыла некантраляваны характар іператварылася ў адну з перадумоў распаду СССР.

Распад СССР быў выкліканы не толькі ўнутранымі, але і знешнепалітычнымі прычынамі. У 1980-я гг. працягвалася «халодная вайна» з ЗША і іх саюзнікамі, якая патрабавала значных ваенных выдаткаў. Савецкі Саюз удзельнічаў у гонцы ўзбраенняў, падтрымліваў саюзныя рэжымы і вёў цяжкую вайну ў Афганістане, пачатую ў 1979 г., што аслабляла эканоміку і пагаршала міжнародны імідж краіны. Захад увёў эканамічныя санкцыі, абмежаваў доступ да тэхналогій і крэдытаў. Падзенне цэн на нафту ў сярэдзіне 1980-х гг. скараціла валютныя паступленні. Абвешчаная ў гады перабудовы палітыка галоснасці і дэмакратызацыі ўзмацніла міжнародны ціск на СССР у пытаннях правоў чалавека. Усё гэта абвастрыла ўнутраны крызіс, што прывёў да распаду краіны ў 1991 г.

**3. Дасягненні і праблемы савецкай сацыяльнай палітыкі.** У СССР вялікую ўвагу надавалі сацыяльнай палітыцы, галоўнай мэтай якой быў рост дабрабыту народа. Сістэма мерапрыемстваў у кожны перыяд залежала ад эканамічных магчымасцей Савецкага Саюза.

| Дасягненні | Цяжкасці |
|---|---|
| **1945 — першая палова 1950-х гг.** | |
| У 1947 г. адменена картачная сістэма размеркавання тавараў першай неабходнасці, праведзена грашовая рэформа, ішло паступовае зніжэнне цэн | Для росту дабрабыту савецкіх людзей не хапала сродкаў, галоўная задача заключалася ў аднаўленні разбуранай у выніку вайны эканомікі і пераводзе яе на мірныя рэйкі. Неўраджай 1946 г. |
| **Другая палова 1950-х — першая палова 1960-х гг.** | |
| Здзяйсненне захадаў для вырашэння жыллёвага пытання, усталяванне аднаго з самых нізкіх у свеце ўзроставых цэнзаў для выхаду на пенсію | Напачатку 1960-х гг. узніклі праблемы з забеспячэннем насельніцтва прадуктамі, былі паднятыя адпускныя цэны на некаторыя прадукты, узмацніўся падатковы ціск на падсобныя гаспадаркі. Гэта адбылося ў значнай ступені праз непрадуманую эканамічную палітыку савецкага кіраўніцтва на чале з М. С. Хрушчовым |
| **Другая палова 1960-х — першая палова 1980-х гг.** | |
| Даступнасць тавараў працяглага карыстання, у тым ліку легкавых аўтамабіляў; рост заробкаў рабочых і служачых; ад 1966 г. зарплату пачалі атрымліваць і калгаснікі; стабільнасць цэн; невысокі кошт камунальных паслуг; бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і адукацыя | Рост дэфіцыту тавараў у сувязі з нарастаннем крызісных з'яў у эканоміцы і зніжэннем тэмпаў эканамічнага росту |

Годныя заробкі і працоўныя пенсіі надавалі савецкім людзям адчуванне стабільнасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

**Высокія маральныя каштоўнасці**

**4. Маральныя нормы і маральныя каштоўнасці савецкага чалавека.** Вялікая Айчынная вайна не зрабіла савецкіх людзей жорсткімі; такія высокія маральныя каштоўнасці, як калектывізм, працавітасць, самаадданасць, бескарыслівасць, патрыятызм, вытрымалі выпрабаванне часам і толькі

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Камуністычная ідэалогія, агульныя палажэнні марксісцкай тэорыі, рэальны характар узаемаадносін паміж савецкімі людзьмі знайшлі адлюстраванне ў Маральным кодэксе будаўніка камунізму — зводзе прынцыпаў камуністычнай маралі, які ўвайшоў у тэкст Трэцяй Праграмы КПСС, прынятай XXII з’ездам (1961), і Статут КПСС:




Плакат СССР. 1979 г.

1) адданасць справе камунізму, любоў да сацыялістычнай Радзімы, краін сацыялізму;

2) добрасумленная праца на карысць грамадства: хто не працуе, той не есць;

3) клопат кожнага пра захаванне і прымнажэнне грамадскага набытку;

4) высокае ўсведамленне грамадскага абавязку, нецярпімасць да парушэнняў грамадскіх інтарэсаў;

5) калектывізм і таварыская ўзаемадапамога: кожны за ўсіх, усе за аднаго;

6) гуманныя адносіны і ўзаемная павага паміж людзьмі: чалавек чалавеку сябар, таварыш і брат;

7) сумленнасць і праўдзівасць, маральная чысціня, прастата і сціпласць у грамадскім і асабістым жыцці;

8) узаемная павага ў сям’і, клопат пра выхаванне дзяцей;

9) нецярпімасць да несправядлівасці, дармаедства, несумленнасці, кар’ерызму, хцівасці;

10) дружба і братэрства ўсіх народаў СССР, нецярпімасць да нацыянальнай і расавай непрыязі;

11) нецярпімасць да ворагаў камунізму, справы міру і свабоды народаў;

12) братэрская салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін, з усімі народамі.

*1. Якія прагрэсіўныя ідэі папярэдніх эпох знайшлі працяг у маральных прынцыпах савецкіх людзей?*

*2. Апішыце грамадства, пра якое марылі савецкія людзі, будуючы камунізм.*

*3. Якія ідэі Маральнага кодэкса будаўніка камунізму з’яўляюцца актуальнымі і ў наш час?*

ўмацаваліся. Салдаты і афіцэры Чырвонай арміі, што вярнуліся з палёў баёў, адказна ставіліся да даручанай справы, ставілі інтарэсы краіны вышэй за ўласны дабрабыт.

Савецкія людзі верылі ў магчымасць пабудовы ідэальнага камуністычнага ладу, пераход да якога быў абвешчаны на XXI з’ездзе КПСС (1959 г.). Абавязковым крокам да гэтага павінна было стаць маральнае ўдасканаленне чалавека.

### Студэнцкія будаўнічыя атрады

Паважлівае стаўленне да працы ў СССР, якое перадавалася маладым пакаленням, знайшло адбітак у дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў (СБА). Першы будатрад быў створаны ў 1959 г. студэнтамі-фізікамі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ




Студэнты сваім удзелам у СБА зрабілі ўнёсак у найбуйнейшыя будоўлі краіны, у тым ліку ўзвядзенне прамысловых прадпрыемстваў, будаўніцтва аўтамабільных і чыгуначных магістраляў, асваенне цалінных зямель і інш. Студэнцкія будаўнічыя атрады існавалі ў СССР аж да роспуску УЛКСМ у 1991 г.

У XXI ст. у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі дзейнасць СБА была адноўлена.

*1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*
*— якія аб’екты былі абвешчаны ў СССР ударнымі камсамольскімі будоўлямі;*
*— калі адроджаны студэнцкія будаўнічыя атрады ў Рэспубліцы Беларусь;*
*— на якіх аб’ектах працавалі студэнцкія будаўнічыя атрады ў Рэспубліцы Беларусь.*
*2. Даведайцеся ў членаў сваёй сям’і (бацькоў, бабулі, дзядулі), ці ўдзельнічалі яны ў студэнцкіх будаўнічых атрадах, на якіх аб’ектах працавалі.*

**5. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкай культуры.** Тэма Вялікай Айчыннай вайны і Вялікай Перамогі савецкага народа ў пасляваенныя гады была асноўнай у савецкім мастацтве.

Вялікая Айчынная вайна — вядучая тэма ў мастацтве

У літаратуру прыйшло пакаленне пісьменнікаў-франтавікоў. Аднымі з самых папулярных сталі раманы А. Фадзеева «Маладая гвардыя», К. Сіманава «Жывыя і мёртвыя».

У другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. літаратурным сімвалам зрабілася аповесць І. Эрэнбурга «Адліга». У 1960-я гг. пашырэнне атрымала творчасць маладых паэтаў Я. Еўтушэнкі, Р. Раждзественскага, А. Вазнясенскага, Б. Ахмадулінай, якія збіралі на свае выступленні цэлыя залы.

У жывапісе атрымалі пашырэнне ваенны і гістарычны жанры.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




*«Маладая гвардыя». Рэжысёр С. Герасімаў. 1948 г.*




*«Маладая гвардыя». Рэжысёр Л. Пляскін. 2015 г.*

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую гістарычную даведку пра камсамольскую падпольную арганізацыю «Маладая гвардыя»: час і месца дзейнасці, удзельнікі, мэты і вынікі дзейнасці.*
2. *Успомніце, дзе ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічалі падпольныя камсамольскія групы.*
3. *Паглядзіце фільм «Маладая гвардыя». Як вы лічыце, чым тлумачыцца зварот рэжысёра да гэтай тэмы ў XXI ст.? Якую ролю адыгрывае культура ў захаванні памяці пра Вялікую Айчынную вайну савецкага народа?*

Якія з твораў гэтых і іншых савецкіх аўтараў вы чыталі? Прывядзіце некалькі аргументаў на карысць прачытання гэтых твораў сучаснікамі.

У другой палове 1960-х — 1980-я гг. у савецкай літаратуры апроч тэмы подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны адлюстроўвалася гістарычная мінуўшчына, атрымаў развіццё жанр фантастычнай літаратуры. У гэты час былі напісаныя: «А зоры тут ціхія...» (Б. Васільеў), «У жніўні сорак чацвёртага» (У. Багамолаў), «Пяром і шпагай», «Слова і справа» (В. Пікуль), «Цяжка быць богам», «Панядзелак пачынаецца ў суботу», «Пікнік на ўзбочыне» (А. Стругацкі, Б. Стругацкі).

Адным з самых папулярных мастакоў 1970–1980-х гг. быў І. Глазуноў. У 1980 г. ён стварыў пано «Унёсак народаў СССР у сусветную культуру і цывілізацыю», якое было падорана ААН і размешчана ў будынку штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы.



*Унёсак народаў СССР у сусветную культуру і цывілізацыю. Мастак І. Глазуноў. 1980 г.*

Якія гістарычныя дзеячы, дзеячы культуры, з'явы прадстаўлены на пано?

Падзеям Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаныя многія савецкія фільмы: «Подзвіг разведчыка» Б. Барнета, «Вясковая настаўніца» М. Данскога, «Маладая гвардыя» С. Герасімава, «Ляцяць жураўлі» С. Калатозава і інш. Савецкія фільмы пра вайну атрымалі сусветнае прызнанне.

Перыядам росквіту савецкага кінематографа зрабіліся другая палова 1960-х — 1980-я гг. Менавіта ў гэты час з’явіліся самыя вядомыя савецкія кінашэдэўры.




*Каўказская нявольніца.*
*Рэжысёр Л. Гайдай.*
*1967 г.*




*Вайна і мір.*
*Рэжысёр С. Бандарчук.*
*1967 г.*




*Масква слязам не верыць.*
*Рэжысёр У. Мяньшоў.*
*1979 г.*




*А зоры тут ціхія.*
*Рэжысёр С. Растоцкі.*
*1972 г.*




*Месца сустрэчы змяніць нельга.*
*Рэжысёр С. Гаварухін.*
*1979 г.*

Якія з савецкіх кінафільмаў атрымалі прэмію «Оскар»?

*1945–1991 гг. у гісторыі СССР былі перыядам аднаўлення краіны пасля Вялікай Айчыннай вайны, мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі і прамысловасці, стварэння новых галін эканомікі, вялікіх дасягненняў у сацыяльнай сферы, навукі і культуры. Поспехі ў развіцці краіны дасягаліся працай многіх пакаленняў савецкіх людзей, для якіх былі характэрныя калектывізм, працавітасць, самаадданасць, патрыятызм. Разам з тым сацыяльна-эканамічны крызіс, які пачаўся ў 1970-я гг., непрадуманыя рэформы другой паловы 1980-х гг. у спалучэнні са знешнепалітычнымі фактарамі прывялі да распаду дзяржавы.*

**калі ў свеце…**

1958 г. — заснаваная першая падземная шахта ў Канадзе, што паклала пачатак індустрыяльнаму вырабу калійных угнаенняў

**на тэрыторыі Беларусі…**

1963 г. — уведзена ў эксплуатацыю першая чарга Салігорскага калійнага камбіната

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце табліцу «Асноўныя этапы развіцця савецкага грамадства ў 1945–1991 гг.». Адлюструйце ў ёй асноўны змест перыяду, вартасці і недахопы мерапрыемстваў, што праводзіліся. Зрабіце вывад наконт прычын, што прывялі да крызісу савецкага грамадства ў другой палове 1980-х гг.
2. Назавіце асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця СССР у 1945–1991 гг. Канкрэтызуйце іх гістарычнымі фактамі.
3. Назавіце асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР у 1945–1991 г. Канкрэтызуйце іх фактамі.
4. Выкарыстоўваючы тэкст параграфа і дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) на тэму «Топ-10 дасягненняў СССР у пасляваенны перыяд».
5. У чым, на ваш погляд, заключалася маральная сіла савецкага грамадства? Якія маральныя каштоўнасці савецкага чалавека важныя і сёння?